Дзяржаўная ўстанова адукацыі
”Дварэцкая сярэдняя школа”

# Класная гадзіна
# “Беларуская мова — сродак зносін”

(гульня)

Падрыхтавала:
Настаўніца пачатковых класаў
Гайдук С.Б.

2019 год

Дата правядзення: 6 снежня 2019 г.

Клас: II

Класны кіраўнік: Гайдук Святлана Бярнатаўна

Месца правядзення: кабінет  II  класа

Час правядзення: 12.20 – 13.05 гадзін

Тэма:  «Беларуская мова — сродак зносін»

Форма: гульня

Мэта: даць вучням уяуленне пра беларускую мову як сродак зносін паміж людзьмі

Задачы: выхоўваць любоў да Радзімы; фарміраваць цікаўнасць да беларускай мовы; развіваць маўленне.

План правядзення

***<u>Расказ настаўніка</u>***

— Сення да мяне прыйшло цікавае пісьмо (настаўнік паказвае і чытае вучням)

Я прыйду да вас у госці, і мы будзем весела гуляць.

Але спачатку мяне паспрабуйце вы адгадаць.

Для гэтага вам трэба адгадаць загадкі і сабраць першыя літары ў слова.

Загадкі

Атрымалася слова — мова.

Сустрэча са спадарыняй Мовай

Заходзіць спадарыня Мова (вучаніца старэйшых класаў )

Спадарыня Мова. Прывітанне, дарагія сябры! Вы вельмі добра адгадалі загадкі. І сёння мы з вамі адправімся ў цікавае падарожжа па маёй краіне. Хто можа сказаць, як называецца гэта краіна? (Краіна беларускай мовы). У

падарожжа мы паляцім на ракеце, а дарогу будзе паказваць карта. (Мова паказвае вучням карту падарожжа.) Падрыхтавацца да палёту!

Вучні. Ёсць падрыхтавацца!

Спадарыня Мова. Завесці маторы!

Вучні. Ёсць завесці маторы!

Спадарыня Мова. Прышпіліць рамні!

Вучні. Ёсць прышпіліць рамні!

Спадарыня Мова. Пяць, чатыры, тры, два, адзін. Пуск.

***Станцыя «Чыстагаворкі і скарагаворкі»***

Знайсці адрозненне у вымаўленні па рускай мове і беларускай мове.

Гром гремит, стреляет, в дубы попадает.

Гром грыміць, страляе, у дубы цаляе.

На гэтай станцыі вучні адпрацоўваюць вымаўленне гукаў, развучваюць чыстагаворкі і скарагаворкі.

Чыстагаворкі і скарагаворкі

Прыдумаць свае чыстагаворкі

Гу-гу-гу…

Га-га-га…

Гы-гы-гы…

***Станцыя «Загадкі»***

Загадкі

Гульня «Прыдумай загадку»

Спадарыня Мова паказвае малюнак, а вучні пачынаюць апісваць прадмет. Настаўнік павінен здагадацца, аб чым ідзе размова.

Ручаёк (які?)… Вецер (які?)… Бусел (які?) … Снег (які?) … Агурок (які?) … Лісіца (якая?)…

***Станцыя «Лічылкі і гульні»***

Настаўнік просіць дзяцей пералічыць лічылкі, якія яны ведаюць, а затым прапануе яшчэ адну лічылку, якая дапамагае вызначыць вядучага ў гульні.

Саломінка, Яромінка прэла, на мора ляцела.

Касцюк, Масцюк, Радзівон, выйдзі вон.

Гульня «Маша»

Усе становяцца ў кола, пасярэдзіне знаходзіцца Маша з завязанымі вачамі. Дзеці прыгаворваюць:

Маша, ты пацеха наша!

Ручкі з золата, ножкі з долата,

Валасы кудлатыя, а вочы зыркатыя.

Маша хапае каго-небудзь з кола і спрабуе адгадаць, хто гэта. Калі яна адгадвае імя дзіцяці, той становіцца Машай, калі не — працягвае лавіць дзяцей і адгадваць.

***<u>Станцыя «Прыказкі і прымаўкі»</u>***

Прыказкі і прымаўкі даюць трапныя, часам вельмі вострыя і ўдалыя вызначэнні розных жыццёвых з'яў, чалавечых якасцей, вучаць дабру.

З прыказак, якія прынесла спадарыня Мова, згубіліся словы: бацьку, гору, працы, насмяшыць, не сумуе. Гэтыя словы трэба ўставіцьу прыказкі і іх растлумачыць.

Шануй бацьку з маткай, другіх не знойдзеш.

Слязамі гору не паможаш.

Чалавек без працы, што птушка без крылаў.

Спяшыць — людзей насмяшыць.

Хто працуе, той не сумуе.

Чытанне і аналіз верша «Міколкавы пытанні»

М. Пазнякоў. Міколкавы пытанні

***<u>Абагульняючая гутарка</u>***

Ці спадабалася вам беларуская мова?

Чым беларуская мова адрозніваецца ад рускай?

Чаму неабходна вывучаць беларускую мову?